кіруе, і гэта не звышнатуральная сіла, а чалавек. Прахожы пазнае сябе ў ім. Сэнс алегорыі наступны: чалавек сваімі дзеяннямі, якія вынікаюць з бездухоўнасці, губіць зямлю, сам стварае канец свету. Таму невыпадкова ў канцы аповесці перад чытачом разгортваецца карціна апакаліпсісу — творча перапрацаваны біблейскі сюжэт, увасоблены ў метафарычна-сімвалічнай моватворчасці пісьменніка.

У самы змрочны і цьмяны, перадапакаліпсічны час Прахожы вырашае будаваць хату, хоць асаблівай практычнай неабходнасці ў гэтым не было: «Прытулак я меў, дах над галавой і цёплую печ. Але ж нешта ці нехта прымусіў мяне будавацца зноў» [8, с. 73]. Хата, якую будуе Прахожы, успрымаецца сімвалічна — як спроба выратаваць чалавецтва ў «цьмяны і жахлівы час»: «Недарэмна мудрыя людзі кажуць: у цьмяны і няпэўны час лепшае, што трэба і належна рабіць, — гэта будавацца» [8, с. 73]. У святле мастацкай ідэі твора хата асацыюецца з Ноевым каўчэгам, што павінен выратаваць чалавецтва ад глабальнай катастрофы. У фінале твора хата, пабудаваная Прахожым, гарыць, але гэты агонь — ачышчальны. Усё дрэннае згарэла, а зямлю «нехта асвячаў і мілаваў… на доўгі і шчаслівы шлях у свеце» [8, с. 73].

**Заключэнне.** Канцэпт *дом* з'яўляецца адным з ключавых у беларускай нацыянальнай літаратуры. Замацаваўшыся ў айчынным прыгожым пісьменстве XIX стагоддзя, дзе служыў абазначэннем жылля чалавека і ўяўляў сабой сімвал радзімы, шчасця, цяпла, утульнасці, творчасці, канцэпт *дом* працягваў дамінаваць у літаратуры XX стагоддзя. *Дом* атрыбутаваны В. Казько як нацыянальная каштоўнасць, што ўказвае на прадаўжэнне беларускай літаратурнай традыцыі.

### Спіс цытуемых крыніц


1. *Степанов, Ю. С.* Константы. Словарь русской культуры / Ю. С. Степанов. — М. : Наука, 1997. — 838 с.
2. Этымалагічны слоўнік беларускай мовы : у 11 т. / Нац. акад. навук Беларусі, Ін-т мовазнаўства імя Я. Коласа ; уклад. В. Авілава [і інш.] ; рэд. Г. Цыхун. — Мн. : Беларус. навука, 2006. — Т. 11. Р—С. — 333 с.
3. Тлумачальны слоўнік беларускай мовы : у 5 т. / рэд. А. Я. Баханькоў. — Мн. : БелЭн, 1978. — Т. 2. Г—К. — 768 с.
4. Міфалогія беларусаў : энцыкл. слоўн. / склад. І. Клімковіч, В. Аўтушка ; навук. рэд. Т. Валодзіна, С. Санько. — Мн. : Беларусь, 2011. — 607 с.
5. *Сыракомля, У.* Выбраныя творы / У. Сыракомля. — Мн. : Маст. літ., 2011. — 584 с.
6. *Каратынскі, В.* Творы / В. Каратынскі. — Мн. : Маст. літ., 2007. — 309 с.
7. *Казько, В.* Хроніка дзетдомаўскага саду / В. Казько. — Мн. : Маст. літ., 1987. — 430 с.
8. *Казько, В.* Прахожы / В. Казько // Полымя. — 1995. — № 9. — С. 24—104.


Материал поступил в редакцию 01.03.2014 г.

**УДК 371.3:811.161.3**

***В. М. Скараход***
Дзяржаўная ўстанова адукацыі «Вучэбна-педагагічны комплекс "Пачапаўская дзіцячы сад — сярэдняя школа"», Пачапава, Баранавіцкі р-н

## ФАРМІРАВАННЕ АРФАГРАФІЧНАЙ ПІЛЬНАСЦІ ПРАЗ ВЫКАРЫСТАННЕ ПРАКТЫКАВАННЯЎ РОЗНЫХ ВІДАЎ НА ЎРОКАХ БЕЛАРУСКАЙ МОВЫ Ў ПАЧАТКОВАЙ ШКОЛЕ

**Уводзіны.** Найбольшае значэнне ў выпрацоўцы навыкаў правільнага пісьма, асабліва ў дасягненні іх найвышэйшай ступені, маюць практыкаванні, паколькі лічыцца, што правіла хоць і арганізуе пісьмо, «але яно само па сабе яшчэ не прыводзіць да правільнага пісьма: напісанне павінна быць замацавана шляхам практыкаванняў так, каб яно стала навыкам» [2, с. 84].

Як адзначае Д. М. Багаяўленскі, разуменне правіла і запамінанне яго слоўнай фармулёўкі з'яўляецца толькі пачатковай фазай, адпраўным пунктам засваення: далейшы лёс гэтага працэсу залежыць ад той дзейнасці, у якой рэгулюючую функцыю выконвае правіла. У якасці такой дзейнасці выступаюць практыкаванні, якія ідуць услед за тлумачэннем правіла.

**Асноўная частка.** Найбольш пашыранымі практыкаваннямі ў пачатковай школе з'яўляюцца такія практыкаванні, як спісванне, дыктанты, свабоднае пісьмо.

Важнейшай іх асаблівасцю з'яўляецца пэўная паслядоўнасць. Вучоныя-метадысты (Д. І. Ціхаміраў, І. П. Саламаноўскі) прапануюць наступную паслядоўнасць практыкаванняў для выпрацоўкі ўстойлівых арфаграфічных навыкаў: І этап — практыкаванні па знаходжанні арфаграм, на якім важна, каб вучні задумваліся над напісаннем слоў, шукалі патрэбную арфаграму; ІІ этап — практыкаванні, якія суправаджаюцца тлумачэннем, абгрунтаваннем напісанняў; ІІІ этап — практыкаванні на дапісванне слоў, устаўку прапушчаных літар і інш. (у працэсе работы такога роду ўменні ўдасканальваюцца і перарастаюць у навыкі); IV этап — практыкаванні на падбор уласных прыкладаў па ўзоры; V этап — сінтэтычныя (творчыя) практыкаванні [3, с. 115].

Спісванне спрыяе развіццю зрокава-маторных асацыяцый вучняў. Так, М. Т. Баранаў адзначае, што ў ⅔ вучняў класа пераважае зрокавая памяць. Перавага зрокавага ўспрымання тэксту перад слыхавым у методыцы навучання арфаграфіі пацвярджаецца наступнымі дадзенымі: пры зрокавым успрыманні тэксту знаходжанне арфаграм у 2—3 разы большае, чым пры слыхавым. На слых вучні знаходзяць 17,7% арфаграм, а пры зрокавым успрыманні — 40,5% [1, с. 113].

Практыка паказвае, што значна больш пашырана ў школьнай практыцы спісванне, якое ўскладняецца дадатковым заданнем (ускладненае спісванне) (напрыклад, «вылучце марфемы», «растлумачце напісанне», «падзяліце на склады», «укажыце націск», «вызначце граматычную форму» і інш.); спісванне са зменамі тэксту (напрыклад, «устаўце прапушчаныя літары», «дапішыце марфему», «змяніце форму слова», «замяніце іншым словам» і інш.); няпоўнае (выбарачнае) спісванне асобных слоў, словазлучэнняў, сказаў і інш.

Дыктанты як від практыкавання разлічаны больш на развіццё маторна-слыхавых асацыяцый вучняў. Яны вучаць успрымаць слова на слых, супастаўляць яго гукавы і літарны склад, дадаткова выпрацоўваюць вучняў арфаэпічныя нормы і ўменне карыстацца правілам [5, с. 208].

У сувязі з многімі асаблівасцямі прымянення дыктанты падзяляюцца на розныя тыпы. У залежнасці ад часу тлумачэння напісанага навучальныя дыктанты бываюць папераджальныя (тлумачэнне папярэднічае навучанню), тлумачальныя (тлумачэнне ідзе пасля напісання слова, словазлучэння, сказа, тэксту). Выбар аднаго з тыпаў дыктантаў падпарадкоўваецца этапу засваення правіла: папераджальны дыктант лепш выкарыстоўваць адразу пасля азнаямлення з правілам, каб не дапускаць няправільнага напісання і вучыць даваць поўныя каментарыі да прымянення правіла; тлумачальны — на этапе засваення правіла [5, с. 207].

У залежнасці ад мэты правядзення вылучаюць кантрольныя і навучальныя дыктанты, да якіх можна аднесці дыктант «Правяраю сябе», паколькі ён спалучае абедзве мэты: вучні самі правяраюць, кантралююць сваё напісанне, высвятляючы пры гэтым усе цяжкія моманты, а ў выніку развіваецца ўменне вылучаць арфаграмы, што з’яўляецца паловай поспеху ў навучанні правільнаму пісьму. Кантрольны дыктант з’яўляецца традыцыйным відам дыктанта. У адносінах да іншых відаў работ па арфаграфіі кантрольны дыктант займае залежнае становішча: ён ніколі не праводзіцца ў пачатку вывучэння новай тэмы, ім таксама не карыстаюцца пры тлумачэнні новага правіла.

Як бачым, арсенал практыкаванняў для выпрацоўкі арфаграфічных навыкаў багаты, але пры іх выбары трэба ўсведамляць месца кожнага практыкавання ў сістэме, вызначаць ролю, якую адыгрывае тое ці іншае практыкаванне, а значыць, ведаць, калі якое прымяняць, каб ад зместу правіла вучань ішоў да выпрацоўкі навыкаў і ўменняў яго прымяняць у новых умовах і далей выпрацоўваў аўтаматычна правільнае пісьмо.

Аналіз дыктантаў, напісаных вучнямі 3—4-х класаў паказаў, што значная частка вучняў адчувае цяжкасці пры засваенні фанетычных напісанняў. Вялікая колькасць памылак допускаецца: 1) на правапіс *у*, *ў* (нескладовае); 2) пры графічным абазначэнні мяккіх зычных *дз* і *ц*; 3) пры абазначэнні мяккасці зычных літарамі *і*, *я*, *е*, *ё*, *ю*, *ь*; 4) пры напісанні галосных пасля зацвярдзелых зычных; 5) на правапіс галосных *о*, *э*, *а*. Шмат памылак прыпадае на перанос і ўжыванне вялікай літары ў словах.

Галоўныя прычыны памылак у фанетычных напісаннях, лічым, наступныя: 1) недастатковы ўзровень агульнага развіцця мовы асобных вучняў; 2) слаба развіты фанематычны слых, невыразнае або няправільнае вымаўленне; 3) уплыў дыялектнага вымаўлення; 4) няўменне аналізаваць слова.

З мэтай фарміравання арфаграфічнай пільнасці і павышэння арфаграфічна-правільнага пісьма на ўроках беларускай мовы ў пачатковых класах могуць быць прапанаваны наступныя віды практыкаванняў: пошук арфаграм ў «чыстым» тэксце, дыктант «з прыстукваннем», самадыктант, узаемадыктант, дыктант-спаборніцтва і інш.

Методыка выкладання практыкавання «пошук арфаграм у “чыстым” тэксце» заключаецца ў наступным: вучням прапаноўваюцца карткі з тэкстам, у якім ёсць памылковыя напісанні, задача вучняў — знайсці і выправіць няправільнае напісанне. На наш погляд, эфектыўнасць такога віду практыкаванняў заключаецца ў тым, што яны развіваюць навыкі самастойнай праверкі работы, вучаць бачыць прабелы ў сваіх ведах і карэкціраваць іх. Прынцып падбору тэксту наступны: матэрыял павінен быць насычаны вывучанымі арфаграмамі і цікавым па змесце.

У час правядзення дыктанта «з прыстукваннем» настаўнік прыстуквае па стале ў той момант, калі дыктуе слова з арфаграмай. Каштоўнасць такога віду практыкавання ў тым, што прыстукванне актывізуе мысленне вучняў, яны не трацяць час на распазнаванне месца арфаграмы.

Самадыктант — гэта від дыктанта, асноўная мэта якога — развіццё навыкаў самакантролю. Работа над дыктантам такога тыпу ўключае наступныя этапы: перад запісам тэкст зрокава ўспрымаецца вучнямі, іх увага акцэнтуецца на вывучанай арфаграме, вучні тлумачаць умовы выбару слоў з дадзенай арфаграмай, потым запісваюць тэкст па памяці, параўноўваюць запіс з узорам.

Практыка пацвярджае эфектыўнасць правядзення ўзаемадыктанта пасля дамашняй падрыхтоўкі вучняў, якая заключаецца ў знаходжанні і выпісванні ў рабочы сшытак з вывучанага на ўроку чытання мастацкага твора 3—5 слоў з дадзенай арфаграмай. Потым вучні графічна абазначаюць умовы выбару

арфаграмы, падбіраюць праверачныя словы да прапанованых, затым — самападрыхтоўка і параўнанне сваёй работы з зыходнай. Праверка ўменняў і навыкаў ажыццяўляецца наступным чынам: вучань дыктуе класу выбраныя словы з мастацкіх твораў, астатнія вучні запісваюць пад дыктоўку словы, затым некалькі вучняў каменціруюць запісаныя словы, работы правярае настаўнік. Такі від практыкаванняў садзейнічае фарміраванню ўмення прымяняць атрыманыя веды ў новых сітуацыях, абуджае цікавасць да работы.

На наш погляд, каштоўнасць дыктанта-спаборніцтва і рэлейнага дыктанта ў тым, што яны выконваюць навучальную і кантралюючую функцыю адначасова. Такія віды дыктантаў праводзяцца па тым матэрыяле, які вывучаўся на працягу некалькіх тыдняў [4, с. 28]. Пры падрыхтоўцы дыктанта-спаборніцтва настаўнік прыкладна за два тыдні рыхтуе тэкст, у які ўключае вывучаныя арфаграмы з некалькіх тэм, выяўляе ўсе арфаграмы і класіфікуе іх. Найбольш складаныя арфаграмы адпрацоўваюцца на ўроках з дабаўленнем пры гэтым іншых слоў на кожнае правіла. За два тыдні да правядзення ўрока вывешваецца аб'ява, у якой паведамляецца дзень правядзення дыктанта-спаборніцтва. У аб'яве ўказваюцца цяжкія для напісання словы, якія неабходна вывучыць; словы, значэнні якіх трэба паглядзець у тлумачальным слоўніку, правілы, якія неабходна паўтарыць; практыкаванні, якія неабходна выканаць пісьмова ці вусна.

Аб правядзенні рэлейнага дыктанта настаўнік паведамляе прыкладна за тыдзень, вучням прапаноўваецца перагледзець свае пісьмовыя работы ў сшытках, звярнуць увагу на словы, у якіх рабіліся памылкі. Рэлейны дыктант можа складацца са звязнага тэксту ці асобных слоў, сказаў, якія вучні запісвалі на працягу некалькіх дзён у свае сшыткі.

Выкарыстанне дыктантаў розных відаў на ўроках беларускай мовы стымулюе пазнавальную актыўнасць вучняў, фарміруе навыкі аналізу дапушчаных раней памылак.

**Заключэнне.** Разнастайнасць відаў і сістэматычнае выкарыстанне нетрадыцыйных практыкаванняў садзейнічае не толькі фарміраванню ўменняў і навыкаў у галіне арфаграфіі, вучыць прыёмам граматыка-арфаграфічнага аналізу слоў і садзейнічае фарміраванню арфаграфічнай пільнасці, але і папярэджвае зніжэнне цікавасці да работы, уносіць ва ўрокі элементы навізны.

### Спіс цытуемых крыніц


1. Методика преподавания русского языка / М. Т. Баранов [и др.]. — Минск : Университетское, 1990. — 282 с.
2. *Бархин, К. Б.* Методика русского языка в средней школе / К. Б. Бархин, Е. С. Истрина. — М. : Просвещение, 1935. — 243 с.
3. *Васюковіч, Л. С.* Методыка выкладання беларускай мовы ў сярэдняй школе : практыкум / Л. С. Васюковіч, М. Г. Яленскі. — Мн. : Універсітэцкае, 1999. — 176 с.
4. *Семенюк, А. А.* Новые виды диктанта / А. А. Семенюк // Рус. яз. в шк. — 1990. — № 4. — С. 27—30.
5. *Яленскі, М. Г.* Методыка выкладання беларускай мовы : вучэб. дапам. для студэнтаў філал. спецыяльнасцей / М. Г. Яленскі. — Мн. : Адукацыя і выхаванне, 2007. — 448 с.



Материал поступил в редакцию 01.03.2014 г.



**УДК 811.161.3'373**



***А. В. Солахаў,*** кандыдат філалагічных навук
Установа адукацыі «Мазырскі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя І. П. Шамякіна», Мазыр


# АДОНІМНЫЯ ІНДЫВІДУАЛЬНА-АЎТАРСКІЯ ДЗЕЯСЛОВЫ: УТВАРЭННЕ, СЕМАНТЫКА, ФУНКЦЫІ

**Уводзіны.** Індывідуальна-аўтарскія неалагізмы (далей — ІАН) — гэта разнавіднасць аказіянальных слоў, якія з'яўляюцца адзінкамі маўлення, утворанымі паэтамі і пісьменнікамі для вырашэння мастацкіх задач па словаўтваральных мадэлях або з парушэннем законаў словаўтварэння і не адзначанымі лексікаграфічнымі працамі. Яны, як правіла, не ўзнаўляюцца і не прэтэндуюць на замацаванне ў мове, а жывуць у пэўным кантэксце, з'яўляючыся прыналежнасцю індывідуальнага стылю аўтараў. У мове беларускіх мастацкіх, асабліва паэтычных, твораў ІАН шырока адзначаюцца ў канцы XX — пачатку XXI стагоддзя. Іх словаўтваральнай базай з'яўляецца пераважна апелятыўная лексіка. Разам з тым нярэдка ў якасці ўтваральных выступаюць онімы — уласныя імёны і назвы. Сярод адонімных ІАН вылучаецца група дзеясловаў.

**Асноўная частка.** У якасці ўтваральных асноў індывідуальна-аўтарскіх дзеясловаў (далей — ІАД) ужываюцца наступныя разнавіднасці онімаў: 1) імёны або прозвішчы паэтаў і пісьменнікаў, іх псеўданімы (*Адольф (Варановіч), Вядзьмак (Лысагорскі), Гайдар, Дзялендзік, Лукша, Навуменка*); 2) асобныя ўласныя імёны (*Дзямід, Юзік*); 3) імёны літаратурных персанажаў (*Дон Жуан*); 4) назвы